Міхаіл Баярын

# УЗОРЫ СВАДЗЕІ

## 1. Выпраява

# Прачын

*Прачын* - гэта разрыў першапоўні напачатку ўсяго. Прачын спараджае дзею як рух да аднаўленьня поўні. Узорам прачыну ёсьць



# Дзея

*Дзея* – гэта чысты незваротны рух наперад. Дзея траістая: заўсёды напрамлена, схапляе ўсё, на што напрамлена, ды ад'яўляе ўсё, што схапляе. Тры праявы дзеі – гэта *напрам*, *схоп* і *ад'ява*.
Узорам дзеі ёсць



# Падзея

Схоп напраму ад'яўляецца як першая *падзея*. Падзея – гэта схопленае, спыненае напрамленьне.

# Відаль і спазор

Падзея спаяўляецца ў ад'яве першаснай дзеі. Са зьяўленьнем падзеі напрам стаецца *відаляй*, а схоп – *спазорам* падзеі.

# Чын

*Чын* - гэта назва першай падзеі. Гэта схопленае напрамленьне. Узорам чыну ёсьць



# Разварот

Зрух відалі ў падзею завецца *развароташ* відалі. Разварот пераносіць відаль і спазор на ад'яву падзеі. Падзея мае ўласную відаль, спазор і ад’яву.

# Дачын

Наступны разварот, зрух відалі ў ад'яўлены чын пераносіць спазор на ад'яву чыну ў чыне. Гэта стварае другую падзею – *дачын*. Узорам дачыну ёсьць



# Ад’ява і роўня

Ад'ява штораз пераводзіць глыбіню ў роўнядзь, робіць адразу дасяжным пасьлядоўнае. Ад’ява штораз ператварае мноства ў адно. Зрух відалі на ад'яву ўтварае *роўню*.

# Сродак

Наступны разварот зрушае відаль у новы чын і робіць спазорам ад'яву дачыну й чыну ў чыне. Гэта стварае трэцюю падзею – *сродак*, якім стаецца чын папярэдняга дачыну. Узорам сродку ёсьць



# Нутраная і вонкая тройцы

Наступны крок развароту ад'яўляе ўсю тройцу чыну, сродку й дачыну. Першая тройца, ад'яўленая ў другой, утварае *шасьцярыцу*. Тры крокі ад'явы ствараюць сувязь шасьці падзеяў.

# Прычына

Чын вонкай тройцы завецца *прычынай*. Узорам прычыны ёсць



# Вычын

Дачын вонкай тройцы завецца *вычынам*. Узорам вычыну ёсьць



# Месца

Сродак вонкай тройцы завецца *месцам*. Узорам месца ёсьць



# Адасоба

Далейшыя развароты бясконца множаць шасьцярыцы падзеяў. Прачын бачыць шасьцярыцу як завершаную *адасобу*. Прачын пераадольвае адасобу шасьцярыцы вяртаньнем відалі ў пачатковы стан і ўсталяваньнем спазору на першай падзеі.

# Асоба

Наступны разварот утварае сёмую падзею: *асобу*, ад'яву відалі прачыну, напрамленага на чын. Зьяўленьне асобы ад'яўляецца адразу ва ўсіх шасьцярыцах. Узорам асобы ёсьць

# Мярэжа падзей

Адносіны падзеяў становяць *мярэжу* падзей. Адна падзея становіць адзіночную мярэжу , дзьве падзеі – двайную , тры падзеі – трайную , чатыры – чацвярную , пяць – пяцярную , шэсьць – шасьцярную , сем – семярную мярэжу .



# Прастора

Зрух відалі ў любую падзею мярэжы падзей заўсёды знаходзіць ад'яву ўсяе мярэжы падзей. Мярэжа падзей бясконца ад'яўляецца ў кожнай падзеі кожнай мярэжы. Стварэньнем падзеі асобы прачын пранікае ва ўсе мярэжы падзей адразу й заўсёды быве ў іх. Гэта ўтварае бясконцую *прастору* свадзеі.

# Сетка

Прастора свадзеі служыць рэчывам выпраявы. Зрух відалі і выбар спазору пракладае дарогу па гэтай прасторы, утвараючы *сетку* свадзеі.

# Раскрыцьцё

Дзея рушыць відаль па падзеях мярэжаў. Спын відалі ў падзеі і наступны разварот стварае ад'яву ўсёй мярэжы падзей у любой падзеі. Ад'ява мярэжы ў падзеі завецца *раскрыцьцём*. Падзея, раскрытая чыстай мярэжай, стаецца *поўнай* - адносна астатніх, нераскрытых падзей. Раскрыцьцё малюе відарысы поўных падзей на аснове засталай мярэжы. Узорам раскрыцьця падзеі ёсьць ×.





# Тоества

Спын спазору на падзеі ад’яўленай мярэжы стварае *тоества* падзеі вонкай мярэжы з падзеяй нутраной мярэжы. Тоесная падзея зьяўляецца першай у раскрыцці.



# Над-мярэжа

Перанос відалі ў падзею нутраной мярэжы творыць наступны ўзровень тоества. Кожны крок тоества творыць асобную *над-мярэжу*. Адносіны ўтоесьненых падзей такія самыя, як у звычайнай мярэжы. Таму тоества мае сем ступеняў.





# Сувой

Тоества дзьвюх падзей утварае *сувой*. Сувоі дзеляцца паводле ўзроўню схапленьня. Вонкая падзея завецца схопнай, а нутраная – схопленай.



# Ніць

Раскрыццё хоць бы адной падзеі мяржэжы становіць *ніць*.



# Развой

Раскрыццё іншых падзей нутраной мярэжы становіць *развой*, які выказвае адну з падзеяў ніці. Падзеі развою ідуць за падзеяй сувою.

# Ткань

Сувязь ніцяў утварае *ткань*, узор падзеяў.

# Аднаякія і разнаякія сувоі

Сувой можа быць аднаякі й разнаякі. Тоества падзеі з адрознай падзеяй нутраной мярэжы ўтварае разнаякі сувой. Тоества падзеі з такой самай падзеяй нутраной мярэжы ўтварае аднаякі сувой.



# Напруга

Утварэньне аднаякага сувою азначае тоества ўсіх падзеяў над-мярэжы з адной і той самай падзеяй. Гэта ўтварае *напругу*, узмацненьне й паглыбленьне падзеі. Узорамі ступені напругі аднаякага сувою суць



# Быцьцё і намер

Першы ровень чыну адпавядае напрамленьню. Напрамленьне чыну без дачыну завецца *быцьцём*. Напрамленьне чыну да дачыну завецца *намерам*. Напруга – гэта ўзмацненьне намеру чыну адносна дачыну.

# Ступені напругі

Напруга намеру праходзіць сем ступеняў:

1. намер
2. рух
3. дотык
4. ахоп
5. прасяг
6. росчын
7. самасьць

# Над-ад’ява

Каб падзея нутраной мярэжы магла схапіць падзею вонкай мярэжы, трэба выйсьці ў  становішча па-над тканінай свадзеі, зь якога яны абедзьве дасяжныя ў *над-ад'яве*, адзінай роўні ад'явы. Іх схапленьне з роўні ад'явы стварае асаблівую над-мярэжу, якая злучае падзеі або мярэжы вышэйшых і ніжэйшых узроўняў. Так тканіна свадзеі расьце з усіх бакоў ва ўсе бакі, ствараючы сетку без пачатку, канца й сярэдзіны.

# Ад’яўная і ад’яўленая падзеі

Над-ад'ява парушае пасьлядоўны лад тканіні і ўтварае крыжаваныя сувязі. Падзея, што тоесьніцца зь іншай падзеяй праз над-ад'яву, завецца *ад'яўленай*, а ўтоесьненая падзея – *ад'яўленай*. Узорам ад'яўнай падзеі ёсьць палова ўзору напругі перад падзеяй -



, а ўзорам ад'яўленай падзеі палова ўзору напругі пасьля падзеі -



Знакі ад'яўленьня скарачаюць ніць над-мярэжы.



# Надпадзеі

Возіркам вылучаюцца *надпадзеі*, што чыняцца дзеяй дзеля стварэньня падзей:

1. ад'ява
2. разварот
3. роўня
4. выбар
5. раскрыцьцё
6. сукрыцьцё
7. тоества
8. напруга

# Паўпадзеі

Спроба паўтарыць надпадзеі над-ад’яўнымі ніцямі ўтварае *паўпадзеі*. Паўпадзея – гэта амаль-падзея, што хаця і ня ёсьць часткай мярэжы падзей, але можа стаць часткай сувою на любым яго ўзроўні. Ніці паўпадзеяў сама-ад’яўныя, яны пачынаюцца і сканчаюцца на адной падзеі. Вылучаюць 14 паўпадзеяў, што маюць наступныя знакі:

ад'ява - самасьць -

разварот - адмова -

роўня - поўня -

выбар - цэль -

раскрыцьцё - ява -

сукрыцьцё - тайна -

тоества - спарыш -

напруга - мага -



# Ператворы

*Ператворы* – гэта над-ад'яўныя ніці, што надаюць іншую якасьць ад'яўленым падзеям. Гэта паўпадзеі, празоры і згорты.

# Празора

Празора – гэта ператвора, што накладае адныя ніці на іншыя ніці, зьмяняючы іх выгляд у роўні ад'явы. Ткані, ад'яўленыя ў празоры, завуцца празорнымі. Першасныя свадзеі – гэта свадзеі прасторы і часу. Празоры накладаюць першасныя свадзеі на іншыя свадзеі і ўтвараюць другасныя свадзеі пачуцьцёвых прастораў.

# Будова празоры

Празора складаецца з чыну – , сродку –  і дачыну – . Зьмяшчэньне ніці ў дачын празоры ўтварае празорань, вынік ператварэньня.



# Празорні

Падзея асобы палягае ў прысваеньні падзеі чыну. Тое самае асоба робіць у сувоі чыну – утварае ўспрыманьне, выдзяленьне пэўнай прасторы для прысваеньня свадзеяў. Адмены сувою утвараюць кола свадзеяў чуцьця і знаньня, адмены развою дачыну – кола чуцьцёвых дачынаў, адмены сродку – перавод у іншыя чуцьцёвыя прасторы. Так, свадзеі вобразаў спаяўляюцца ў роўні ад’явы першасных свадзей у празоры ахопу. Празора ахопу стварае свадзеі здоляў пачуцьця выявы, стварэньня выявы, дачын ахопу, напаўненьне якога дае свадзеі ўсіх магчымых вобразаў.

 – празора перажываньня

 – 'вырух'



– 'гнеў'

# Зьверш

*Зьверш* зыходзіць са стараны прачыну. Зьверш вяртае выпраяву ў адзею або супадае з прачынам новае дзеі. Дзея, што мае зьверш, называецца зьвершанай, дзея, што ня мае зьвершы, завецца нязьвершанай. Узорам зьвершы ёсьць

# Адзея і ўдзея

Раскрыццё падзеі новым прачынам спараджае *ўдзею* ўнутры дзеі. Дзея, што раскрываецца ўдзеяй, завецца *адзеяй*. Канец адзеі сканчае ўсе ўдзеі.

# Прадзея і пасьлядзея

Дзея, як і падзея, можа быць раскрыта новай падзеяй. Раскрыцьцё дзеі патрабуе яе закрыцьця. Схопная дзея называецца *пра-дзеяй*. Схопленая дзея называецца *пасьля-дзеяй*. Раскрыцьцё дзеяў доўжыць *рад* дзеяў.

# Прамова

Падзея, мярэжа, сувой, ніць, ткань і празора складаюць узроўні выпраявы свадзейнай *прамовы*. Прамова папярэднічае імёнам і явам, сьведам і мовам як аснова іх утварэньня. Прамова мае нечасовы ўзыходна-глыбінны лад. Прамова ўтварае ўсемагчымасьць свадзеі.

# Узоры Свадзеі

Знакі падзей, паўпадзей, напругі і ад'явы ўтвараюць узоры свадзеі. Узоры свадзеі выяўляюць ніці і ткані прамовы. Гэта ўзоры дзеяньняў, што ўтвараюць свадзеі.

 – дзея

 – падзеі

 – паўпадзеі

 – напругі

# Іншаназвы

*Іншаназвы* замяняюць імёны падзеяў пытаньнямі і адказамі і ўжываюцца дзеля тлумачэньня ўзораў свадзеі.

- прычына - адкуль? ад каго? ад чаго?

- чын - што чыніць?

- сродак - з чым? з кім?

- дачын - каго? што?

- месца - дзе? у чым? у кім?

- вычын - каму? чаму?

- асоба - хто? што?

 – ад(дзе)

 – на(адкуль)

 – чыніць(ад(дзе))

# Узыход выпраявы

Сьцег выпраявы апісвае круг, спаўняючы ўсе магчымасьці свадзеі і ўзыходзіць на новы ўзровень. Выпраява ўзрастае самаўзыходам.

1. дзея
2. падзея
3. мярэжа
4. сувой
5. ніць
6. ткань
7. празора
8. згорт

# Свадзея

Свадзея – гэта самаўзыходжаньне дзеі, што самаад'явай разварочвае з адзінага прачыну ўсе магчымыя розьніцы. Выпраява росьціць і галініць сетку свадзеі. Свадзея яднае сабой усю сетку, і кожная частка сеткі мае сваю свадзею.

# Мова

*Мова* – гэта дзея злучэньня імя і аб’ёму.

# Сетка імён

Імёны могуць быць аб’ёмам іншых імён, аб’ёмы могуць зьмяшчаць у сабе імёны. Так узьнікае сетка імён, дзе імёны ўтвараюць вузлы, а аб’ёмы – сувязі. Імёны імён утвараюць сувязі родаў і відаў.



# Дрэва імён

Прастора дзеі мовы становіць дрэва імён – усеагульнае дрэва развояў прамовы. Дзея мовы злучае вузлы сеткі імён з галінамі дрэва імён мярэжамі над-ад’явы. Знаходжаньне імя на дрэве імён называецца *месцам* імя.



# Мова моў

Дрэва, галіны якога злучаюць сабой іншыя дрэвы імён, утварае *мову моў*. Імёнамі мовы моў суць прасторы імён, што падзяляюцца на галіны імён *умоў*. Для мовы моў дасяжны імёны ўмоў любога ўзроуню. Такое імя ўлучае ў сябе імёны сваіх *амоў*, моў вышэйшага ўзроуню.



# Згорт

Згорт – гэта ператвора наданьня імені пэўнаму аб’ёму. Лучнасьць згортаў складае мову. Згорт зьвязвае імя ў сетцы імён зь месцам на дрэве імён. Згорт складаецца зь чыну згорту – , асобы згорту – , дачыну згорту – і сродку згорту – . Аб'ём стаецца дачынам згорту, імя – асобай згорту, а месца – сродкам ізгорту.



# Празорная мова

Прамая выява свадзеі ў празоры становіць празорную мову, у якой імя і аб’ём згорту супадаюць.

# Свадзейная мова

Свадзейная мова ёсьць ад'яўленьне прамовы. Аб‘ёмы такой мовы складаюць падзеі і паўпадзеі, а імёны – наставы узнаўленьня свадзеі.

# Веды свадзеі

Веды свадзеі маюць сем частак:

1. выпраява
2. сувой
3. ніць
4. празора
5. дзея
6. мова
7. сьведа

# Выпраява

Усё ёсьць незваротная дзея, якая бясконца расьце і рушыць наперад. Дзея спараджае бясконцасьць ад’яваў мярэжы як сваю апору, і рушачы па ёй, творыць узоры свадзеі. Дзея ўвесь час узыходзіць да роўні ад’явы створанай тканіны і далучае да яе новыя ўзоры. Так сетка свадзеі расьце ва ўсе бакі, ня маючы ў сабе ні пачатку, ні канца, ні сярэдзіны.